УДК 94:327((47+57):474.5)(094.2)«1920»:94:327((47+57):438)(094.2)«1921»:94:327(100)

***Мікалай Мікалаевіч Мязга***
*д-р гіст. навук, праф., заг. каф. усеагульнай гісторыі*
*Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны*
***Mikalai Miazga***
*Doctor of Historical Sciences, Professor, Head of the Department of General History*
*of Francisk Skorina Gomel State University*
e-mail: miazgamm65@gmail.com

# «ВІЛЕНСКАЕ ПЫТАННЕ» Ў МАСКОЎСКІМ 1920 г. І РЫЖСКІМ 1921 г. ДАГАВОРАХ У КАНТЭКСЦЕ ФАРМІРАВАННЯ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

*Разгледжаны палажэнні савецка-літоўскага Маскоўскага 1920 г. і савецка-польскага Рыжскага 1921 г. дагавораў, якія датычыліся «віленскага пытання». Гэтыя палажэнні разглядаюцца ў кантэксце фарміравання Версальскай сістэмы міжнародных адносін на яе ўсходнееўрапейскай перыферыі. Паказана, што ў Маскоўскім і Рыжскім дагаворах былі закладзены глыбокія супярэчнасці пры вырашэнні пытання аб прыналежнасці Вільні і часткі беларускіх паўночна-заходніх тэрыторый. Разуменне ўладамі Польшчы таго, што Літва будзе шукаць падтрымкі Савецкай Расіі ў вырашэнні «віленскага пытання», адбілася на вызначэнні лініі мяжы ў адпаведнасці з Рыжскім дагаворам на яе паўночным участку. Наяўнасць «віленскага канфлікту» паміж Польшчай і Літвой аслабляла ўстойлівасць Версальскай сістэмы ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Па-першае, Савецкая Расія імкнулася выкарыстаць «віленскі канфлікт» у сваёй антыверсальскай палітыцы. Па-другое, вядучыя краіны Захаду, якія складалі ядро Версальскай сістэмы, так і не змаглі дабіцца вырашэння «віленскага пытання» ў адпаведнасці з іх бачаннем.*

***Ключавыя словы:*** *міжнародныя адносіны, «віленскае пытанне», Маскоўскі дагавор, Рыжскі дагавор, Версальская сістэма, Літва, Польшча, Савецкая Расія.*

## *Vilna Question in Moscow 1920 and the Riga Treaties of 1921 in the Context of the Formation of the Versailles System of International Relations*

*The article examines the provisions of the Soviet-Lithuanian Moscow Treaty of 1920 and the Soviet-Polish Riga Treaty of 1921, which dealt with the Vilna issue. These provisions are characterized in the context of the formation of the Versailles system of international relations on its Eastern European periphery. It is indicated that the Moscow and Riga treaties contained deep contradictions in resolving the issue of ownership of Vilna and part of the Belarusian northwestern territories. The understanding by the Polish ruling circles that Lithuania would seek the support of Soviet Russia in resolving the Vilna issue was reflected in the passage of the border line in accordance with the Riga Treaty in its northern section. The presence of the Vilna conflict between Poland and Lithuania weakened the stability of the Versailles system in Central and Eastern Europe. First, Soviet Russia sought to use the Vilna conflict in its anti-universal policy. Secondly, the leading countries of the West, which formed the core of the Versailles system, have not been able to achieve a solution to the Vilna issue in accordance with their vision.*

***Key words:*** *international relations, «the Vilna question», the Moscow Treaty, the Riga Treaty, the Versailles system, Lithuania, Poland, Soviet Russia.*

## Уводзіны

На Парыжскай мірнай канферэнцыі краіны Антанты стварылі асновы пасляваеннага міжнароднага парадку ў Еўропе. Аднак у адносінах да Цэнтральна-Усходняй Еўропы фарміраванне Версальскай сістэмы мела сваю спецыфіку. У гэтым рэгіёне было заключана яшчэ шэраг дагавораў, якія карэктавалі і дапаўнялі рашэнні, прынятыя ў Парыжы. У артыкуле мы спынімся на двух такіх дагаворах: Маскоўскім савецка-літоўскім 1920 г. і Рыжскім савецка-польскім 1921 г. Гэтыя пагадненні мелі важнае значэння для Беларусі. Яны закраналі пытанне яе тэрытарыяльнай цэласнасці і істотна ўплывалі на станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў этнічных межах.

Мэта артыкула – вызначыць уплыў савецка-літоўскага і савецка-польскага дагавораў на фарміраванне Версальскага міжнароднага парадку ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе і месца Беларусі ў новай сістэме міжнародных адносін.

Сярод работ літоўскіх гісторыкаў, прысвечаных акрэсленай праблематыцы, у першую чаргу неабходна адзначыць працы А. Касперавічуса, які прыйшоў да высновы, што Савецкая Расія не была зацікаўлена ва ўрэгуляванні «віленскай праблемы», і яе падтрымку Літвы ў канфлікце з Польшчай з-за Вільні нельга лічыць актыўнай і паслядоўнай [1]. Літоўскі гісторык Ч. Лаўрынавічус лічыць, што імкненне атрымаць савецкую падтрымку ў «віленскім канфлікце» ператварыла Літву ў пратэктарат Савецкай Расіі [2].

У польскай гістарыяграфіі найбольш грунтоўна даследаваў польска-літоўскі канфлікт вакол Вільні П. Ласоўскі. Ён зрабіў выснову, што польскія палітыкі дапусцілі памылку, імкнучыся дамагчыся ўрэгулявання адносін з Літвой на аснове цеснага палітычнага саюза або федэрацыі. З іншага боку, П. Ласоўскі адзначае, што тэрытарыяльныя прэтэнзіі Літвы былі неабгрунтаванымі, літоўскае кіраўніцтва не жадала ісці на кампраміс з Польшчай [3].

На думку расійскага даследчыка М. С. Паўлавай, «вялікія дзяржавы» на Парыжскай канферэнцыі 1919 г. не прынялі канчатковага рашэння аб усходняй мяжы Польшчы і не прызналі дэ-юрэ Літву. Тым самым яны фактычна пацвердзілі права Расіі на ўдзел у вырашэнні пытання аб межах у гэтым рэгіёне. Такая пазіцыя Антанты падштурхоўвала Літву да таго, каб шукаць падтрымкі Савецкай Расіі ў справе прызнання сваёй дзяржаўнасці і межаў [4].

З кароткага агляду гістарыяграфіі вынікае, што такі аспект «віленскага пытання», як яго ўплыў на фарміраванне Версальска-Рыжскага міжнароднага парадку ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, не быў прадметам глыбокага даследавання.

**Асноўная частка**

7 мая 1920 г. пачаліся савецка-літоўскія мірныя перамовы. Літоўскі ўрад выказаў гатоўнасць заключыць мірны дагавор з РСФСР пры ўмове прызнання Крамлём незалежнасці Літвы са сталіцай у Вільні. Аднак тэрытарыяльныя прэтэнзіі Літвы выклікалі негатыўную рэакцыю Масквы. У маі перамовы зайшлі ў тупік. Як справядліва заўважае расійскі гісторык Д. А. Кораткава, літоўскі ўрад у сваіх прэтэнзіях зыходзіў з гістарычных правоў Літвы на шэраг тэрыторый і не ўлічваў этнічнага складу іх насельніцтва. З беларускіх тэрыторый ён выказваў прэтэнзіі на Гродзенскую губерню і Навагрудскі павет Мінскай губерні [5, с. 176].

Кіраўнік савецкай дэлегацыі на перамовах з Літвой А. Іофе лічыў магчымым нават разрыў з літоўцамі, калі яны не адмовяцца ад сваіх тэрытарыяльных прэтэнзій. Аднак з такой пазіцыяй быў рашуча не згодны Г. Чычэрын. 22 мая ў лісце У. Леніну ён пісаў, што дзеля ваеннага супрацоўніцтва з Літвой супраць Польшчы і для разрыву *«ўскраіннага кардону»* варта пайсці на саступкі Літве ў тэрытарыяльным пытанні. На значнасць ваеннага садзейнічання з боку Літвы супраць Польшчы ў лісце ў Палітбюро ЦК РКП(б) указваў камандуючы Заходнім фронтам М. Тухачэўскі. Ён прапаноўваў *«падштурхнуць літоўскі ўрад»* да правядзення аперацыі па захопу Вільні. Палітбюро на пасяджэнні 10 мая прыняло рашэнне даручыць А. Іофе ажыццявіць крокі, накіраваныя на рэалізацыю прапановы Тухачэўскага [6]. На перамовах, якія аднавіліся 22 чэрвеня, савецкая дэлегацыя заявіла аб немагчымасці задаволіць усе тэрытарыяльныя прэтэнзіі Літвы, але пагадзілася на далучэнне да яе Ашмянаў, Ліды, Гродна. Прадстаўнікі Літвы прынялі гэты кампрамісны варыянт [5, с. 180, 183]. Аднак, улічваючы памеры тэрытарыяльных саступак Літве, У. Ленін да апошняга моманту вагаўся ў падпісанні дагавора. Яшчэ 10 ліпеня ў запісцы М. Крэсцінскаму і Г. Чычэрыну ён лічыў магчымым пагадзіцца на падпісанне савецка-літоўскага дагавора толькі ў выпадку яго адабрэння ЦК РКП(б) [7].

Тэрытарыяльныя саступкі савецкага боку на карысць Літвы былі зафіксаваныя ў савецка-літоўскім мірным дагаворы ад 12 ліпеня 1920 г. Прычым дагавор вызначаў усталяваную мяжу як мяжу паміж Літвой і Расіяй, і нідзе ў тэксце не згадваецца фармальна яшчэ не ліквідаваная ССРЛіБ [8, с. 29]. Але, заключыўшы дамову з «буржуазнай» Літвой, РСФСР тым самым зафіксавала ліквідацыю ССРЛіБ. За жаданне мець Літву ў якасці саюзніка ў барацьбе з Польшчай савецкі расійскі ўрад саступаў ёй паўночна-заходнія беларускія тэрыторыі. У. Ленін пісаў 20 ліпеня члену рэўваенсавета Заходняга фронту І. Смілзе аб неабходнасці выкарыстоўваць літоўскія часткі для прасле-

давання палякаў [7]. У дадатку да арт. 11 савецка-літоўскага дагавора гаварылася, што факт пераходу расійскімі войскамі літоўскай мяжы і заняцце імі часткі тэрыторыі, якая ў адпаведнасці з гэтым дагаворам з'яўляецца літоўскай, не будзе разглядацца ўрадам Літвы як недружалюбны акт. Аднак прадугледжвалася, што пры мінаванні ваенна-стратэгічнай патрэбы, расійскія войскі будуць выведзеныя з тэрыторыі Літвы [7]. Для вырашэння «віленскага пытання» важна было, што зафіксаваная ў савецка-літоўскім дагаворы прыналежнасць Вільні Літве супадала з англійскай пазіцыяй. У рапарце польскай амбасады ў Лондане адзначалася, што Міністэрства замежных спраў Вялікабрытаніі зыходзіла з таго, што, згодна з пастановамі, прынятымі ў СПА, Вільня павінна належаць Літве, і Антанта не плануе мяняць гэтую пазіцыю [9, с. 422].

У Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ адносна межаў было сказана, што яна *«вызначае сваю заходнюю мяжу па этнаграфічнай мяжы паміж Беларуссю і буржуазнымі дзяржавамі, якія прымыкаюць да яе»* [8, с. 74]. З тэксту расійска-літоўскага дагавора ад 12 ліпеня 1920 г. незразумела, якім чынам павінен быў рэалізоўвацца этнічны прынцып пры правядзенні мяжы паміж ССРБ і Літвой, у склад якой паводле гэтага дагавора ўвайшла частка беларускіх этнічных тэрыторый. Адказ на гэтае пытанне заключаецца ў тым, што саступкі Літве ў той момант разглядаліся савецкім кіраўніцтвам як часовыя, і ва ўмовах наступлення Чырвонай Арміі на Варшаву бальшавікі абмяркоўвалі пытанне саветызацыі Літвы. У падрыхтаваным У. Леніным праекце тэзісаў да ліпеньскага пленуму ЦК РКП(б) гаварылася, што неабходна дапамагчы *«пралетарыяту і рабочым масам... Літвы вызваліцца ад іх буржуазіі і памешчыкаў»* [10, с. 354]. У пачатку жніўня толькі невырашальныя праблемы з забеспячэннем насельніцтва Вільні харчаваннем прымусілі бальшавікоў прыняць рашэнне перадаць яе Літве. Пры гэтым Ленін пісаў: *«Мы лічым усё гэта не адмовай ад саветызацыі Літвы, а адтэрміноўкай і перайначваннем формы саветызацыі»* [10, с. 358].

9 кастрычніка 1920 г. дывізія генерала Жалігоўскага, парушыўшы дэмаркацыйную лінію з Літвой, усталяваную двума днямі раней Сувалкаўскім дагаворам, захапіла Вільню. Ю. Пілсудскі пісаў пасля, што захоп Жалігоўскім Вільні быў па яго ўказанні, каб паставіць Антанту перад здзейсненым фактам [11, s. 124]. Дзеянні Жалігоўскага былі парушэннем і пастановы канферэнцыі саюзнікаў у СПА ад 10 ліпеня 1920 г., прынятай пры ўдзеле прадстаўнікоў Польшчы, адносна прыналежнасці Вільні Літве. Тым самым Польшча дэманстравала самастойнасць у стварэнні новага міжнароднага парадку ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, які ўступаў у супярэчнасць з планамі дзяржаў, якія былі ядром Версальскай сістэмы.

Пры гэтым палітыка Польшчы ў ліпені – жніўні 1920 г. сутыкнулася з імкненнем Англіі правесці карэкціроўку міжнароднага парадку ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, устаноўленага Версальскім дагаворам. Англійскі прэм'ер-міністр Д. Ллойд Джордж лічыў, што момант, калі Чырвоная Армія паспяхова наступала на Варшаву, быў спрыяльным для рэалізацыі такога намеру. На гэта і была нацэлена праектаваная ў ноце Керзана Савецкаму ўраду ад 11 ліпеня 1920 г. Лонданская канферэнцыя. Прычым змяненне міжнароднага парадку ва Усходняй Еўропе павінна было адбыцца за кошт задавальнення Савецкай Расіі. Нота Керзана ўтрымлівала такія выгадныя для яе палажэнні, як мяжа па Бугу і далучэнне Усходняй Галіцыі [8, с. 54–55]. 11 жніўня У. Ленін інфармаваў І. Сталіна, што, па паведамленні Л. Каменева, *«Ллойд Джордж заявіў, што раіць Польшчы прыняць нашы ўмовы перамір'я, якія ўключаюць і раззбраенне, і перадачу зброі рабочым, і зямлю, і іншае»*. У яго тэлеграме К. Данішэўскаму гаварылася *«аб нашым вялікім дыпламатычным поспеху ў Англіі наконт Польшчы»* [12, с. 254, 255]. Л. Каменеў у гэтай сувязі звярнуў увагу Леніна на *«нечаканае згадванне»* Усходняй Галіцыі з Львовам, якую Керзан *«авансам абвясціў рускай»*, а з гэтага вынікала не толькі магчымасць, але і абавязак *«уступіць у Галіцыю і заняць Львоў»* [13, с. 208]. У дзеяннях англійскай дыпламатыі праглядаецца імкненне рэфармаваць Версальскую сістэму ў духу пагаднення «вялікіх дзяржаў» з удзелам Расіі. Аднак савецкае кіраўніцтва адхіліла англійскую прапанову. Яно абрала варыянт перабудовы Цэнтральна-Усходняй Еўропы, звязаны з рэалізацыяй ідэі сусветнай рэвалю-

цыі. Ва ўмовах паспяховага наступлення Чырвонай Арміі Ленін лічыў магчымым «саветызаваць» Польшчу, Літву, Італію, Венгрыю, *«а, можа быць, таксама Чэхію і Румынію»* [10, с. 354, 357].

Д. Ллойд Джордж, выступаючы ў парламенце 10 жніўня, заявіў, што толькі ў тым выпадку, калі на савецка-польскіх перамовах *«будзе закранута незалежнасць і суверэнітэт Польшчы»*, саюзныя дзяржавы павінны выступіць у яе падтрымку. Савецкая дэлегацыя ў Лондане зрабіла выснову: Д. Ллойд Джордж хапаўся за любую магчымасць, каб пазбегнуць вайны з Расіяй [7].

Яшчэ падчас мірных перагавораў паміж Савецкай Расіяй і Польшчай вызначылася разуменне Масквой і Варшавай ролі Літвы ў межах Версальскага міжнароднага парадку як моста паміж Савецкай Расіяй і Германіяй.

І. Смілга прапаноўваў 14 ліпеня ЦК РКП(б) прайсці *«да германскай мяжы найкарацейшым шляхам праз Літву»* [14, с. 177]. Польскі бок спрабаваў не дапусціць такога ходу падзей. На савецка-польскіх перамовах у Рызе Варшава дамагалася выгаднай для сябе дэмаркацыі паўночна-ўсходняга ўчастка савецка-польскай мяжы, якая адрэзала б Савецкую Расію ад Літвы і, адпаведна, ускладніла расійска-германскае ўзаемадзеянне праз яе. 2 кастрычніка А. Іофе пераслаў у Маскву польскія прапановы аб мяжы і звяртаў увагу на тое, што лінія мяжы адразае Расію ад Літвы, а такім чынам і ад Германіі. Прычым кіраўнік польскай дэлегацыі Я. Домбскі заявіў, што гэтая лінія мяжы абавязковая [7]. Ленін настойваў на прыняцці ўмовы, аднак лічыў неабходным паспрабаваць патаргавацца, каб Расію не адрэзалі ад Літвы, і забяспечыць свабоду транзіту і ў Германію і Літву [13, с. 263].

З санкцыі палітбюро Г. Чычэрын на другім этапе перагавораў у Рызе прапанаваў Польшчы тэрытарыяльныя саступкі па Украіне ў абмен на тэрыторыі, якія мяжуюць з Літвой. Палітбюро ўхваліла гэтую прапанову на пасяджэнні 24 лістапада [15]. Але абмен тэрыторыямі з мэтай ліквідацыі Дзеснянскага калідора не адбыўся. У шыфроўцы савецкаму прадстаўніку ў Коўне Аксельроду ад 18 студзеня 1921 г. Чычэрын пісаў: *«Адносна калідора палякі непахісныя. Мы ж не можам аднаўляць вайну дзеля гэтага другараднага пытання, але гэта не перашкодзіць нам аказваць дыпламатычнае садзейнічанне Літве»* [5, с. 214, 215]. Сучасны польскі гісторык А. Новак справядліва адзначае, што аддзяленне расійскага цэнтра камунізму ад Германіі (галоўнай мэты яе рэвалюцыйных планаў у Еўропе, а таксама стратэгічна важнага эканамічнага партнёра) было галоўнай геапалітычнай задачай, вырашэнню якой павінен быў спрыяць Рыжскі мір [16, с. 115]. Таму Польшча не схільная была ісці на саступкі ў пытанні аб тэрытарыяльным калідоры, які адрэзаў савецкія рэспублікі ад Літвы. Гэта і было замацавана ў Рыжскім дагаворы. Яго трэці артыкул канстатаваў адмову *«Расіі і Украіны ад усялякіх правоў і дамаганняў на землі, размешчаныя на захад ад мяжы, апісанай у арт. 2 гэтага дагавора»*. Далей адзначалася, што пытанне аб прыналежнасці спрэчных паміж Літвой і Польшчай тэрыторый *«падлягае вырашэнню выключна паміж Польшчай і Літвой»* [8, с. 623].

Тэрытарыяльныя набыткі Польшчы шляхам стварэння Сярэдняй Літвы і па Рыжскім дагаворы не былі прызнаныя Антантай. Прадстаўнік Польшчы ў Лізе Нацый І. Падэрэўскі пісаў Я. Сапегу, што Англія патрабуе *«суровага пакарання за Вільню... Падтрымка Францыі значна аслабела»* [14, с. 195]. У маі 1921 г. Д. Ллойд Джордж заявіў у парламенце, што Вільня акупіравана Польшчай насуперак жаданням Антанты [17, арк. 29, 39].

Польшча разумела хісткасць сваіх усходніх межаў і імкнулася ўмацаваць іх, у т. л. праз збліжэнне з краінамі Усходняй Прыбалтыкі. Пагадзімся з польскім гісторыкам М. Корнатам, што магчымасці Варшавы па стварэнні сістэмы гарантый ва Усходняй Еўропе з удзелам названых дзяржаў шмат у чым залежалі ад пазіцыі вядучых краін Захаду [18, с. 317]. Як адзначаў Я. Сапега, нават стаўленне саюзнага Парыжа да польскіх ідэй збліжэння з прыбалтыйскімі дзяржавамі было адмоўным, бо яно магло б пашкодзіць інтарэсам *«нацыянальнай Расіі»*. Праўда, што да Літвы, то тут Сапега бачыў супадзенне пазіцыі Польшчы з пазіцыяй Францыі, якая лічыла Літву *«інструментам нямецкіх інтрыг»* [19, s. 110]. Супадзенне пазіцый Варшавы і Парыжа бачылі і ў Маскве. Са слоў Чычэрына, Польшча хоча праз Заходнюю Беларусь аддзяліць *«нас новым калідорам... [і] пажыраць*

*Літву... Францыя... думае пра герметычнае аддзяленне нас ад Літвы, гэта значыць... ад Германіі... прапанаваны ў Рызе палякамі польска-латышскі калідор ёсць французская выдумка»* [14, с. 197]. «Віленскае пытанне» стала яшчэ адной перашкодай у рэалізацыі польскага плана па стварэнні сістэмы гарантый у Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Польска-літоўскі канфлікт быў сур'ёзным бар'ерам для рэалізацыі ідэі саюза Польшчы з краінамі Усходняй Прыбалтыкі.

Рыжскі дагавор садзейнічаў паступоваму пераходу бальшавікоў да абароны сваіх інтарэсаў шляхам збліжэння з Германіяй. Гэта павышала значнасць Літвы як моста паміж Расіяй і Германіяй. 18 мая 1921 г. Г. Чычэрын, устрывожаны лёсам Рыжскага дагавора з-за затрымак з усталяваннем дыпламатычных зносін з Польшчай, прапаноўваў савецкаму прадстаўніку ў Коўне С. Аралову не перашкаджаць сумеснаму літоўска-германскаму выступленню супраць Польшчы, а таксама перадачы Літве нямецкай зброі [4, с. 77]. За падтрымку ў канфлікце з Польшчай Масква патрабавала ад літоўскага ўрада пэўнай платы, якая ўключала правядзенне палітыкі сяброўства ў адносінах да БССР, абавязацельства дамагчыся ад урада В. Ластоўскага, каб ён адмовіўся ад прэтэнзій на ўладу ў Беларусі і прызнаў БССР. У канцы лютага 1921 г. праз літоўскі ўрад было атрымана афіцыйнае запэўніванне Ластоўскага, што яго ўрад не прэтэндуе на ўладу на тэрыторыі БССР. Акрамя таго, Літва паабяцала прызнаць Савецкую Беларусь як адзінае законнае прадстаўніцтва беларускага народа [5, с. 214, 215].

Заключэнне Рыжскага дагавора не азначала, што бальшавікі адмовіліся ад ідэі руйнавання Версальскай сістэмы. Рыжскі мір у гэтай барацьбе, паводле прамовы Леніна на IX канферэнцыі РКП(б) 22 верасня 1920 г., быў толькі перадышкай: сабраўшыся з сіламі, Савецкая Расія зноў пяройдзе ў наступ, вынікам якога стане поўны разгром Версальскай сістэмы [20, с. 75]. Захаванне польска-літоўскай спрэчкі з-за Вільні аслабляла ўстойлівасць Версальскай сістэмы ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Так, падтрыманая Расіяй, Літва адмовілася ад прапанаванага ёй Лігай Нацый вырашэння «віленскага канфлікту» [13, с. 207]. Польска-літоўскае супрацьстаянне было перашкодай для будаўніцтва санітарнага кардона супраць Савецкай Расіі. Без Літвы ён не меў завершанай формы. Г. Чычэрын адзначыў у гэтай сувязі: *«Нашага сябра Літву імкнуцца перацягнуць з аднаго боку пагрозамі, з другога боку прынадамі»* [14, с. 196].

Зацікаўленасць Літвы ва ўзаемадзеянні з РСФСР па «віленскім пытанні», як адзначалася, закранала і Беларусь. Паўночна-заходнія беларускія землі, паводле Маскоўскага дагавора з Літвой, лічыліся літоўскімі, а паводле Рыжскага дагавора Масква ад свайго імя і ад імя БССР прызнавала іх польскімі. Вынікае, што роля названых дагавораў для Версальскай сістэмы досыць супярэчлівая, асабліва Рыжскага. Я. Сапега яшчэ да заканчэння перамоваў у Рызе пісаў: *«Асновай гэтага парадку мы імкнемся бачыць дзве дамовы: Версальскую і Рыжскую. Сіла Версальскага дагавора заключаецца ў подпісах і гарантыях усіх дзяржаў – саюзнікаў і дружалюбных дзяржаў. Яго цэласнасць з'яўляецца адным з асноўных нацыянальных інтарэсаў Польшчы. Міжнародныя пазіцыі Рыжскага дагавора, яшчэ не падпісанага, значна слабейшыя. Тым самым стабілізацыя яго палажэнняў з'яўляецца адной з галоўных задач польскай палітыкі ў бліжэйшы час»* [18, с. 313]. Відавочна імкненне міністра замежных спраў Польшчы зрабіць Рыжскі дагавор кампанентам міжнароднага парадку ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе нароўні з Версальскай дамовай. Савецка-літоўскі ж дагавор падрываў прымальны для Польшчы міжнародны парадак у гэтым рэгіёне. Пра гэта сведчыць і змест савецка-літоўскага дагавора 1926 г. Коўна і Масква ўзаемна пацвярджалі абавязковасць тэрытарыяльных пастаноў дагавора 1920 г., г. зн. і тое, што заходнебеларускія землі павінны належаць СССР. Менавіта ў гэтым пытанні польскі ўрад запатрабаваў тлумачэнняў ад паўнамоцнага прадстаўніка ў Варшаве П. Войкава, якому каштавала немалых намаганняў пераканаць суразмоўцу, што новы дагавор не закранае беларускіх земляў [21, с. 161].

**Заключэнне**

Савецка-літоўскі мірны дагавор 1920 г. і савецка-польскі мірны дагавор 1921 г. ператваралі «віленскае пытанне» ў фактар нестабільнасці ў межах Версальскай сістэмы міжнародных адносін на яе ўсходнееўрапейскай перыферыі. Гэта было звязана з

тым, што ў двух названых дагаворах утрымліваліся па сутнасці супрацьлеглыя палажэнні, якія вызначалі статус Віленшчыны. Гэтая акалічнасць рабіла цяжка вырашальным польска-літоўскі канфлікт. Савецкая Расія атрымала магчымасць выкарыстоўваць яго ў сваёй палітыцы, накіраванай на падрыў устойлівасці Версальскай сістэмы. Палажэнні Маскоўскага і Рыжскага дагавораў па «віленскім пытанні» ўступалі ў супярэчнасці з пазіцыяй дзяржаў, якія склалі ядро Версальскай сістэмы. Гэта таксама аслабляла ўстойлівасць дадзеных палажэнняў і ўсяго міжнароднага парадку ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, які ўсталяваўся ў пачатку 1920-х гг. Савецка-літоўскі і савецка-польскі дагаворы вызначылі і супярэчлівы міжнародны статус паўночна-заходніх беларускіх этнічных тэрыторый, бо ўсталёўвалі іх розную дзяржаўную прыналежнасць.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Kasperavičius, A. Didysis X Lietuvos uzsienio politikoje: 1926 metu lietuvos ir Sovietu sajungos nepuolimo sutartics sudarymo analize / A. Kasperavičius. – Vilnius : Lietuvos istorijos institutes, 1996. – 363 p.

2. Laurinavičius, Č. Lietuvos-Sovietu Rusijos Tajkos sutarties: 1920 m. liepos 12 d. sutarsties problema / Č. Laurinavičius. – Vilnius : Valstybinis Leidybos centras, 1992. – 215 p.

3. Lossowski, P. Konflikt polsko-litewski. 1918–1920 / P. Lossowski. – Warszawa : Pax, 1996. – 243 s.

4. Павлова, М. С. Литва в политике Варшавы и Москвы в 1918–1926 гг. / М. С. Павлова. – М. : Аспект-Пресс, 2016. – 176 с.

5. Короткова, Д. А. Белоруссия в советско-польских отношениях в 1918–1921 гг. : дис. … канд. ист. наук / Д. А. Короткова. – М. : МГУ им. М. В. Ломоносова, 2015. – 252 л.

6. Протокол заседания политического бюро ЦК РКП(б) от 10 мая 1920 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=57349;tab=img0076. – Дата доступа: 20.01.2019.

7. Историко-документальный проект «Польско-советская война 1919–1921 гг. Рижский мирный договор» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://pswar.rusarchives.ru. – Дата доступа: 20.10.2023.

8. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1959. – Т. 3. – 723 с.

9. Dokumenty do historii stosunków polsko-soweckich. 1918–1945 : w 4 t. – Warszawa : CPRDP, 2020. – T. 1, cz. 1. – 751 s.

10. В. И. Ленин. Неизвестные документы. 1891–1922 гг. – М. : РОССПЭН, 2000. – 607 с.

11. Piłsudski, J. Pisma zbiorowe : w 8 t. / J. Piłsudski. – Warszawa : Inst. J. Pilsudskiego, 1937. – T. 6. – 217 s.

12. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. / В. И. Ленин. – М. : Изд-во полит. лит., 1981. – Т. 51. – 574 с.

13. Яжборовская, И. С. Россия и Польша. Синдром войны. 1920 г. / И. С. Яжборовская, В. С. Парсаданова. – М. : Academia, 2005. – 404 с.

14. Зубачевский, В. А. Политика России в Центрально-Восточной Европе (первая треть XX века): геополитический аспект / В. А. Зубачевский. – Омск : Изд-во ОмГПУ, 2018. – 396 с.

15. Протокол политического бюро ЦК РКП(б) от 24 ноября 1920 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://sovdoc.rusarchives.ru/sections/government//cards/58004/images. – Дата доступа: 20.01.2019.

16. Новак, А. Рижский мир: интерпретации и последствия для международной политики / А. Новак // Забытый мир. Рижский договор 1921 года: интерпретации и споры / под ред. С. Дембского, А. В. Мальгина (рус. изд.). – М. : Аспект-Пресс, 2014. – С. 111–137.

17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 325. Воп. 1. Спр. 178.

18. Корнат, М. Рижский договор и основы польской внешней политики (1921–1939) / М. Корнат // Забытый мир. Рижский договор 1921 года: интерпретации и споры / под ред. С. Дембского, А. В. Мальгина (рус. изд.). – М. : Аспект-Пресс, 2014. – С. 302–338.

19. Dokumenty z dziejów polskiej polityki zagranicznej 1918–1939 : w 2 t. – Warszawa : Pax, 1989. – T. 1. – 540 s.

20. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.) : у 4 т. – Мінск : Юніпак, 2008. – Т. 1, ч. 2. – 394 с.

21. Павлова, М. С. Советско-литовский договор о ненападении 1926 г.: обстоятельства подготовки и ратификации / М. С. Павлова // Петерб. ист. журн. – 2014. – № 2. – С. 153–166.

REFERENCES

1. Kasperavičius, A. Didysis X Lietuvos uzsienio politikoje: 1926 metu lietuvos ir Sovietu sajungos nepuolimo sutartics sudarymo analize / A. Kasperavičius. – Vilnius : Lietuvos istorijos institutes, 1996. – 363 p.

2. Laurinavičius, Č. Lietuvos-Sovietu Rusijos Tajkos sutarties: 1920 m. liepos 12 d. sutarsties problema / Č. Laurinavičius. – Vilnius : Valstybinis Leidybos centras, 1992. – 215 p.

3. Lossowski, P. Konflikt polsko-litewski. 1918–1920 / P. Lossowski. – Warszawa : Pax, 1996. – 243 s.

4. Pavlova, M. S. Litva v politikie Varshavy i Moskvy v 1918–1926 gg. / M. S. Pavlova. – M. : Aspiekt-Press, 2016. – 176 s.

5. Korotkova, D. A. Bielorussija v sovietsko-pol'skikh otnoshenijakh v 1918–1921 gg. : dis. … kand. ist. nauk / D. A. Korotkova. – M. : MGU im. M. V. Lomonosova, 2015 – 252 l.

6. Protokol zasiedanija politichieskogo biuro CK RKP(b) ot 10 maja 1920 g. [Eliektronnyj riesurs]. – Riezhim dostupa: http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=57349;tab=img0076. – Data dostupa: 20.01.2019.

7. Istoriko-dokumiental'nyj projekt «Pol'sko-sovietskaja vojna 1919–1921 gg. Rizhskij mirnyj dogovor» [Eliektronnyj riesurs]. – Riezhim dostupa: http://pswar.rusarchives.ru. – Data dostupa: 20.10.2023.

8. Dokumienty vnieshniej politiki SSSR : v 24 t. – M. : Gos. izd-vo polit. lit., 1959. – T. 3. – 723 s.

9. Dokumenty do historii stosunków polsko-soweckich. 1918–1945 : w 4 t. – Warszawa : CPRDP, 2020. – T. 1, cz. 1. – 751 s.

10. V. I. Lienin. Neizviestnyje dokumienty. 1891–1922 gg. – M. : ROSSPEN, 2000. – 607 s.

11. Piłsudski, J. Pisma zbiorowe : w 8 t. / J. Piłsudski. – Warszawa : Inst. J. Pilsudskiego, 1937. – T. 6. – 217 s.

12. Lienin, V. I. Polnoe sobranie sochinienij : v 55 t. / V. I. Lienin. – M. : Izd-vo polit. lit., 1981. – T. 51. – 574 s.

13. Jazhborovskaja, I. S. Rossija i Pol'sha. Sindpom vojny. 1920 g. / I. S. Jazhborovskaja, V. S. Parsadanova. – M. : Academia, 2005. – 404 s.

14. Zubachievskij, V. A. Politika Rossii v Central'no-Vostochnoj Jevropie (piervaja triet' XX vieka): gieopolitichieskij aspiekt / V. A. Zubachevskij. – Omsk : Izd-vo OmGPU, 2018. – 396 s.

15. Protokol politichieskogo biuro CK RKP(b) ot 24 nojabria 1920 g. [Eliektronnyj riesurs]. – Riezhim dostupa: http://sovdoc.rusarchives.ru/sections/government//cards/58004/images. – Data dostupa: 20. 01. 2019.

16. Novak, A. Rizhskij mir: interprietacii i posliedstvija dlia miezhdunarodnoj politiki / A. Novak // Zabytyj mir. Rizhskij dogovor 1921 goda: interprietacii i spory / pod ried. S. Dembskogo, A. V. Mal'gina (rus. izd.). – M. : Aspiekt-Press, 2014. – S. 111–137.

17. Nacyjanal'ny arkhiu Respubliki Bielarus'. – F. 325. Vop. 1. Spr. 178.

18. Kornat, M. Rizhskij dogovor i osnovy pol'skoj vnieshniej politiki (1921–1939) / M. Kornat // Zabytyj mir. Rizhskij dogovor 1921 goda: interprietacii i spory / pod ried. S. Dembskogo, A. V. Mal'gina (rus. izd.). – M. : Aspiekt-Press, 2014. – S. 302–338.

19. Dokumenty z dziejów polskiej polityki zagranicznej 1918–1939 : w 2 t. – Warszawa : Pax, 1989. – T. 1. – 540 s.

20. Bielarus' u palitycy susiednikh i zakhodnikh dziarzhau (1918–1920 hh.) : u 4 t. – Minsk : Junipak, 2008. – T. 1, ch. 2. – 394.

21. Pavlova, M. S. Sovietsko-litovskij dogovor o nienapadenii 1926 g.: obstojatiel'stva podgotovki i ratifikacii / M. S. Pavlova // Pietierb. ist. zhurn. – 2014. – № 2. – S. 153–166.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 15.12.2023*